**Гардзейчык Віялета, 11 група**

Што патрэбна чалавеку ў жыцці? Няма, бадай, на свеце таго, хто б не хацеў быць шчаслівым, не марыў бы пра шчасце і не імкнуўся б да яго. Кожны разумее шчасце па-свойму: увага і ласка, шчырае слова, добрая казка, усмешка, лёгкая сцежка, сябры... Усё пералічанае – праявы жыцця. Кожны можа прадоўжыць спіс таго, што для яго ёсць “простае шчасце людское”.

На мой погляд, па-сапраўднаму шчаслівы той, хто будуе шчасце не толькі для сябе, хто любіць людзей, каго яны паважаюць і любяць. Шчасце – гэта не толькі мець, браць, атрымліваць. Шчасце і ў тым, каб аддаваць, дапамагаць іншым, дзяліцца з імі радасцю. Шчаслівы чалавек не можа быць абыякавым да чужой бяды. Але важна навучыцца знаходзіць іскрынкі шчасця ў будзённым жыцці. І з гэтых іскрынак, калі яны збяруцца разам, можа ўспыхнуць факел, які будзе асвятляць шлях чалавечнасцю і дабрынёй. І яшчэ вельмі добра, калі ты патрэбны людзям, калі цябе чакаюць, калі табе дзякуюць за дапамогу, за параду. Ці ж гэта не шчасце?!

Але шчасце не прыходзіць само па сабе. Каб здабыць яго, дасягнуць пастаўленай мэты, трэба актыўна дзейнічаць. Асабістае жыццё людзей цесна знітавана з жыццём усяго народа, краіны. Хіба можна быць па-сапраўднаму шчаслівым, калі вакол усе астатнія няшчасныя?

...Кожны разумее шчасце па-свойму. Але ўсе людзі на зямлі, дзе б яны ні жылі, аднолькава ўсведамляюць, што няма і не можа быць шчасця без міру.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ